# ЗМЕСТ

## Легенды

**Адкуль свет пайшоў**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................4
**Адкуль пайшлі беларусы**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................4
**Чаму немаўляты не ходзяць**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................6
**Зямля**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................7
**Страцім-лебедзь**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................8
**Вырай**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................9
**Чаму конь аніколі не пад'есць**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................9
**Чаму ў сенакос і ў жніво ідзе дождж**
*Апрацаваў Якуб Колас* ...............................10
**Мядзведзь**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................11
**Адкуль каза**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................12
**Бусел**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................13
**Вужовы кароль**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................14

## Паданні

**Зачараваны замак**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................16
**Змееў камень**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................17
**Возера Нарач**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ...................18

**Пра Нёман і Лошу**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ..................21
**Менеск**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 22
**Бярэсце**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 22
**Браслаў**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 23
**Адкуль найменне Гомель**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 25
**Адкуль назва Івянец**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 25
**Жодзіна**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 26
**Машэка**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 27
**Сіні калодзеж**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 28
**Святы калодзеж**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 29
**Бяздоннае багацце**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 30
**Пане Каханку**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*...................31
**Чорная дама**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 33

## Казкі пра жывёл

**Вясёлы кош**
*Апрацавала Крыстына Лялько*.................. 36
**Чаму ў Беларусі львоў няма**
*Апрацавала Крыстына Лялько*.................. 37
**Музыкі**
*Апрацаваў Якуб Колас*............................ 40
**Курачка-рабка**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................ 43

**Як курачка пеўніка ратавала**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................ 44
**Як кот звяроў напалохаў**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................ 46
**Зайкіна хатка**
*Апрацаваў Якуб Колас* ........................ 50
**Былінка і верабей**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................ 53
**Жораў і чапля**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................ 55
**Зайчыкі**
*Апрацаваў Якуб Колас* ........................57

## Легендарныя казкі

**Мудры Саламон**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 60
**Ліха абыходзь, а дабра не мінай**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 61
**Адкуль узяліся грыбы**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 62
**Несцерка**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 64
**Маскаль у пекле**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 68
**Грошы**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................. 69
**Прагны поп**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 73
**Палешукі і палевікі**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................75
**Найлепшы прыяцель**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*..................78
**Лесавік**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*..................79
**Ваўкалак**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*..................81
**Лазнік**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*.................. 82

**Хут**
*Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* .................... 83
**Вядзьмак**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................... 84
**Цуд**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................... 86

## Чарадзейныя казкі

**Шкляныя горы**
*Апрацавала Крыстына Лялько* .................... 90
**Паморак**
*Апрацаваў Лявон Баршчэўскі* .................... 103
**Каток – залаты лабок**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 108
**Піліпка-сынок**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 110
**Гарошак**
*Апрацаваў Якуб Колас* .................... 115
**Кот Максім**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 121
**Прагны багацей**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 131
**Сынок з кулачок**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 133
**Залатая яблынька**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 136
**Удовін сын**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 142
**Хведар Набілкін і сапраўдныя асілкі**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 164
**Ох і залатая табакерка**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 170
**Як музыка мядзведзя граць вучыў**
*Апрацавала Крыстына Лялько* .................... 180
**З рога ўсяго многа**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................... 183

**Дасціпны пеўнік**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 192
**Залатое пяро**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 194
**Жалезныя чаравікі**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 205
**Сіняя Світа**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ........ 210
**Два камені**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 214
**Янка-стралец**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 216
**Два браты**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 225
**Чароўныя гуслі**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 230
**Мядзяны воўк**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 233
**Ведзьма-зладзейка**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 241
**Васіль-чараўнік**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 246
**Сын Адзінец**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 253
**Каваль і аднавокае гора**
*Апрацавала Крыстына Лялько* ........ 263

## Сацыяльна-бытавыя і авантурна-навелістычныя казкі

**Асцярожлівы пасланец**
*Апрацаваў Лявон Баршчэўскі* ........ 268
**Страхі**
*Апрацаваў Лявон Баршчэўскі* ........ 273
**Стары бацька**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 276

**Не вытрываў**
*Апрацаваў Якуб Колас* ............................278
**Разумная дачка**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................282
**Шаптуха**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................290
**Недалікатны сын**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................292
**Стралец і рыбак**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................294
**Надакучлівыя госці**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................298
**Не сіла, а смеласць**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................300
**Не кажы «гоп», пакуль не пераскочыш**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................303
**Панская ласка**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................305
**Рыжы і лысы**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................307
**Кулак і парабак**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................309
**Як мужык царскага генерала правучыў**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................310
**Ад крадзенага не пасыцееш**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................314
**Пану навука**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................316
**Людзей слухай, а свой розум май**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................321
**Катаржнік і староста**
*Апрацаваў Лявон Баршчэўскі* ......................323

## Слоўнічак

*Склаў Уладзімір Сіўчыкаў*............................326

## Адкуль свет пайшоў

Як стварыў пан Бог белы свет, дык загадаў сонейку свяціць і на добрых і на ліхіх.

Але сонейка не схацела свяціць на ліхіх і стала скардзіцца пану Богу, што цяжка яму свяціць заўсёды.

Пашкадаваў тады пан Бог сонейка і загадаў яму свяціць толькі ўдзень, калі робяць свае справы людзі добрыя, а ўначы, як гуляюць ліхія, не свяціць, а адпачываць.

## Адкуль пайшлі беларусы

Калі яшчэ свет толькі пачынаўся, дык анічога анідзе не было. Паўсюль стаяла толькі нежывая вада, а пасярод тае вады тырчэў адно толькі агромністы валун.

Разыграўся аднаго разу Пярун дый давай цаляць сваімі стрэламі ў той валун. Пырснулі ад тых стрэлаў тры яскаркі: белая, жоўтая і чырвоная.

Упалі тыя яскаркі на ваду, і ад іх уся вада скаламуцілася, а свет спахмурнеў як хмары.

Але па некаторым часе, як усё прасвятлілася, дык і азначылася – дзе вада, а дзе зямля.

А яшчэ па некаторым часе завялося разнастайнае жыццё і ў вадзе, і на зямлі. Завяліся і лясы, і травы, і звяры, і рыбы, і чалавек завёўся.

Па некаторым часе стаў заводзіць гэты чалавек свае чалавечыя парадкі. Доўга ён жыў ці мала, але займеў сваю сялібу, нямала жонак, а яшчэ больш дзяцей.

Было таму чалавеку прозвішча Бай, а як прыйшла ягоная апошняя гадзіна, дык паклікаў ён сваіх сыноў дый падзяліў паміж імі ўсю сваю маёмасць.

Забыўся толькі на аднаго свайго сына Белаполя, бо тым часам той быў на паляванні з любімымі сабакамі Стаўры і Гаўры.

Неўзабаве пасля бацькавага сыходу ў лепшы свет вярнуўся Белаполь з палявання, а браты і кажуць яму:

– Падзяліў бацька між намі ўсю сваю маёмасць. Табе адказаў ён сабак Стаўры і Гаўры. Наказаў ён, каб пусціў ты іх па волі: аднаго ў правы бок, а другога – у левы. Колькі абшару аббягуць яны за дзень, дык уся тая зямля тваёй будзе.

Пайшоў тады Белаполь і ўпаляваў дзвюх птушак, што прыляцелі з-за мора паўднёвага дый з-за мора заходняга.

Пусціў ён адну птушку на поўдзень дый нацкаваў сабаку Стаўры:

– Вазьмі!

Пусціў Белаполь другую птушку на захад, а следам за ёю сабаку Гаўры:

– Хапай!

Паляцелі тыя птушкі ў розныя бакі, а сабакі панесліся за імі, дый так, што зямля пад імі закурэла…

Так панесліся тыя сабакі, што й дагэтуль не вярнуліся, але па іхніх слядах працягнуліся дзве рэчкі: на поўдзень пайшоў Дняпро, а на захад пралегла Дзвіна.

Паміж тымі абшарамі пачаў Белаполь сяліцца дый заводзіць свае лады і парадкі.

# Зачараваны замак

На возеры Дрысвяты ёсць востраў, які называецца Замкам. Там сапраўды калісьці стаяў магутны замак і быў драўляны касцёл. Потым ворагі замак зруйнавалі, а касцёл спалілі, ацалеў толькі звон.

Людзі пабудавалі новы касцёл і вырашылі перавезці звон, што застаўся на востраве. Аднак на паўдарозе лодка перавярнулася, і звон апынуўся на дне. З таго часу мінула шмат стагоддзяў. Старадаўні звон і па сённяшні дзень адзываецца пад вадой. Яго можна пачуць, калі на досвітку прыкласці вуха да берага возера…

А вось што здарылася нядаўна. Два хлопцы касілі на Замку сена. Раптам адзін з іх шаргануў аб штосьці касой. Адкінуўшы траву, хлопец убачыў прыкапаны куфар. Ён хацеў падняць века, але не здолеў, таму паклікаў на дапамогу сябра. Удвух яны адчынілі куфар і ўбачылі залатыя дукаты.

Узрадаваныя хлопцы дамовіліся падзяліць скарб. Яны кінулі касіць і вярнуліся дахаты, каб узяць торбы. А вечарам, калі сцямнела, хутчэй паплылі на востраў. Калі бераг застаўся далёка, у лодку хлынула вада. Хлопцы ледзь не ўтапіліся, але неяк дабраліся да вострава.

Да раніцы яны шукалі куфар, але так і не знайшлі дукатаў. Востраў Замак не аддаў ім зачараваны скарб.

– Каб не паслухалі мяне ды не схаваліся, ён бы нас усіх з'еў! Ну і страшэнны звер!

А кот з хітрай лісіцай нагасцяваліся ды пайшлі сабе дахаты.

## Зайкіна хатка

Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.

Жылі яны непадалёку адзін ад другога. Прыйшла восень. Холадна стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык – з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкіна стаіць, як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкіну хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася. Пайшоў зайка з свайго двара, сеў пад бярозкаю ды плача. Ідзе воўк. Бачыць – зайка плача.

– Чаго ты, зайка, плачаш? – пытае воўк.

– Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я – з труску-пяску, а яна – з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама ў ёй жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

– Не плач, зайка. Пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з тваε хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Воўк стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку: